Міжнародная
платформа
па прыцягненні вінаватых да адказнасці

для Беларусі

# Пятая справаздача аб ходзе работы дзяржавам, якія аказваюць падтрымку

31 красавіка па 30 верасня 2023 года



Публічная

ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННЮ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ 3

КАРОТКІ ЗМЕСТ 4

A. Сітуацыя ў краіне 7
B. Выкананне асноўных мэтаў Платформы 8
a. Збор, захоўванне і аналіз інфармацыі і доказаў 9
b. Дапамога органам па прыцягненню вінаватых да адказнасці 9
i. Экспертыза УВКПЧ ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі 9
ii. Дакладчык Маскоўскага механізма АБСЕ 10
iii. Органы крымінальнага правасуддзя 11
c. Захоўваючыяся праблемы 12
C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу 12
D. Падтрымка доступу да паслуг па ахове псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымцы 12
E. Умацаванне падыходу Платформы, арыентаванага на пацярпелых і які ўлічвае аспекты атрыманых траўмаў 13
a. Метадалогія: кансультацыі па падыходах, арыентаваных на пацярпелых, у рабоце з дакументамі 13
b. Наступныя крокі 13
F. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне 14
G. Інфраструктура Платформы 15
H. Перспектыўнае планаванне — Фаза III і пасля яе скančэння 15

Зноскі 17

## ПРА МІЖНАРОДНУЮ ПЛАТФОРМУ ПА ПРЫЦЯГНЕННЮ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Міжнародная платформа па прыцягненню вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB) [тут і далей — «Платформа»] — гэта кааліцыя незалежных няўрадавых арганізацый, якія аб'ядналі намаганні для збору, кансалідацыі, праверкі і захавання доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі па класіфікацыі міжнароднага права, што, як мяркуецца, былі ўчынены беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. З гэтай мэтай Платформа абапіраецца на бягучую працу беларускіх праваабарончых арганізацый па зборы інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Інфармацыя і доказы, сабраныя Платформай, будуць садзейнічаць незалежным і справядлівым крымінальным расследаванням і пераследу, у адпаведнасці з міжнародным правам і стандартамі, у нацыянальных або міжнародных судах або трыбуналах, чыя юрысдыкцыя можа распаўсюджавацца альбо распаўсюджаваецца на гэтыя злачынствы. Інфармацыя і доказы таксама падтрымаюць іншыя механізмы, накіраваныя на забеспячэнне адказнасці за злачынствы па класіфікацыі міжнароднага права, меркавана здзейсненым у Беларусі, у прыватнасці падтрымаюць механізм Экспертызы УВКПЧ ААН па разглядзе сітуацыі ў Беларусі.

Платформа складаецца з Кіруючага камітэта, які адказвае за кіраўніцтва працай Платформы, Сакратарыята і Кансультатыўнай рады. У склад Кіруючага камітэта ўваходзяць DIGNITY — Дацкі інстытут супраць катаванняў (старшыня Платформы), Праваабарончы цэнтр «Вясна» (сустаршыня), Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі (сустаршыня) і арганізацыя REDRESS (сустаршыня). Акрамя шэрагу беларускіх арганізацый, якія не пажадалі быць публічна названымі па меркаваннях бяспекі, у склад Кансультатыўнай рады ўваходзяць наступныя арганізацыі: Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR), Міжнародная федэрацыя па правах чалавека (FIDH), Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў (IRCT), Нарвежскі Хельсінкскі камітэт (NHC), міжнародная арганізацыя «Лекары за правы чалавека» (PHR), міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» (RSF) і Сусветная арганізацыя супраць катаванняў (OMCT). Праца Платформы вядзецца Сакратарыятам, што складаецца з юрыстаў і медыкаў, маючых веды і дасведчаных у галіне міжнародных крымінальных расследаванняў і судаводства.

Платформа была створана 24 сакавіка 2021 года ў адказ на справаздачу дакладчыка Маскоўскага механізма Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) Пастаяннай радзе АБСЕ 5 лістапада 2020 года. Сярод іншага, справаздача заклікае дзяржавы прыцягнуць да адказнасці асоб, вінаватых у катаваннях і бесчалавечным абыходжанні, у тым ліку сэксуальным гвалце, і ў іншых грубых парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 9 жніўня 2020 года.

Платформа карыстаецца падтрымкай шырокага кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Ірландыі, Ісландыі, Канады, Латвіі, Літвы, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцары, Швецыі, Эстоніі, а таксама Еўрапейскага Звязу.

## КАРОТКІ ЗМЕСТ

Пятая справаздача аб ходзе работы Платформы супадае з завяршэннем Фазы II яе працы, што з'яўляецца важнай вяхой на шляху да дасягнення яе мэтаў. На момант завяршэння Фазы II Платформа скончыла падрыхтоўку дакладаў, якія змяшчаюць аналіз інфармацыі і патэнцыйных доказаў, сабраных для органаў крымінальнага правасуддзя трох краін, якія запыталі інфармацыю. Адказваючы на гэтыя запыты, Платформа імкнецца садзейнічаць бягучым крымінальным расследаванням або ініцыяваць іх, і тым самым забяспечыць правядзенне эфектыўных, дбайных, незалежных і бесстаронніх расследаванняў і судовы пераслед меркаваных вінаватых у здзяйсненні злачынстваў паводле кваліфікацыі міжнароднага права, а таксама забяспечыць доступ да сродкаў прававой абароны й пакрыццё шкоды пацярпелым/ахвярам.

Гэтая інфармацыя падаецца ў той час, калі сітуацыя ў Беларусі працягвае пагаршацца. Па стане на 30 верасня 2023 года ў месцах пазбаўлення волі застаюцца 1 490 палітвязняў (уключаючы 164 жанчыны), два з якіх — Мікалай Клімовіч і Алесь Пушкін — памерлі ў зняволенні ў справаздачны перыяд. Вядомыя апазіцыйныя палітыкі, у тым ліку Марыя Калеснікава, Мікалай Статкевіч, Сяргей Ціханоўскі і Віктар Бабарыка, знаходзяцца пад вартай без сувязі са знешнім светам ужо сем месяцаў. Па стане на 30 верасня 2023 года ў «Спіс грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці» за ўдзел у вулічных пратэстах або ў іншых формах меркаванага іншадумства ўнесена 3 358 асоб. КДБ РБ і МУС РБ таксама прызналі экстрэмісцкімі 148 арганізацый, у тым ліку Праваабарончы цэнтр «Вясна». У пачатку верасня 2023 года Лукашэнка выдаў указ, які абмяжоўвае правы беларускіх грамадзян, якія жывуць за мяжой, на атрыманне новых пашпартоў у консульскіх установах, а таксама на ажыццяўленне грамадзянска-прававых здзелак па распараджэнні маёмасцю і адміністрацыйных працэдур па даверанасцях, выдадзеных за межамі Беларусі. Лукашэнка таксама запрасіў расейскую прыватную вайсковую кампанію (ПВК) «Група Вагнера» увайсці ў Беларусь і дазволіў размясціць расейскую ядзерную зброю на тэрыторыі Беларусі, што ўяўляе сабой прамую пагрозу бяспецы беларускіх грамадзян і жыхароў краіны, і шырэйшай рэгіянальнай і еўрапейскай бяспецы.

### Збор, кансалідацыя, захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў

У справаздачны перыяд Платформа атрымала інфармацыю і доказы ад 143 пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў (104 мужчыны і 39 жанчын) у дачыненні да меркаваных злачынстваў згодна з кваліфікацыяй міжнароднага права, у выніку чаго агульная колькасць дакументаў у закрытай базе дадзеных Платформы — каля 21 092. Платформа працягвае запытваць у пацярпелых/ахвяраў і ў іншых сведкаў іх актуалізаваную інфармаваную згоду, каб гарантаваць, што такая згода застаецца актуальнай на момант перадачы любой прадстаўленай імі інфармацыі і патэнцыйных доказаў трэцім бакам. Платформа таксама сабрала больш за 815 643 матэрыялы з адкрытых крыніц, у тым ліку 112 019 відэазапісаў, 344 592 выявы і 358 899 тэкставых матэрыялаў з 580 адкрытых крыніц.

### Дапамога органам па прыцягненню вінаватых у здзяйсненні злачынстваў да адказнасці

Платформа працягнула аказваць падтрымку **УВКПЧ ААН у правядзенні экспертызы сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі** (Экспертыза УВКПЧ па Беларусі), аказаўшы садзейнічанне ва ўзаемадзеянні са 123 пацярпелымі/ахвярамі і іншымі сведкамі, і пачаўшы аналіз, патрэбны для забеспячэння доступу (у кастрычніку 2023 года) да дадатковай інфармацыі і доказаў, якія датычацца шэрагу парушэнняў правоў чалавека, мяркавана ўчыненых у Беларусі.

Платформа таксама падтрымала прафесара Эрве Асэнсіа — **дакладчыка Маскоўскага механізму Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ)**, — даўшы яму доступ да 105 спраў, якія адносяцца да перыяду з лютага па сакавік 2022 года, а таксама да спраў аб сэксуальным гвалце або аб абвінавачваннях у экстрэмізме; яму

было перададзена 50 кароткіх апісанняў гэтых спраў, вынікі аналізу матэрыялаў з адкрытых крыніц, якія датычацца дзяржаўнай палітыкі па ўчыненні злачынстваў згодна з кваліфікацыяй міжнароднага права, а таксама рэкамендацыі адносна патрэбы ў прыцягненні вінаватых да адказнасці. Выявіўшы, што ў Беларусі дзяржаўнымі суб'ектамі быў здзейснены шэраг парушэнняў правоў чалавека, прафесар Асэнсіа ў сваім дакладзе для АБСЕ заклікаў міжнародную супольнасць зрабіць усе неабходныя крокі для прыцягнення вінаватых у рэпрэсіях у Беларусі да адказнасці і падтрымаць ініцыятывы, накіраваныя на пратакаляванне і дакументаванне парушэнняў правоў чалавека ў краіне, у тым ліку падтрымаць працу Платформы.

Платформа завяршыла дбайны аналіз сваёй базы дадзеных і ў бліжэйшы час скончыць перадачу матэрыялаў у **органы крымінальнага правасуддзя** ў дзвюх дзяржавах. Гэтыя матэрыялы змяшчаюць аналіз фактаў і юрыдычны аналіз асноўных дзеянняў і кантэкстуальных элементаў злачынстваў супраць чалавечнасці, а таксама ролі структур дзяржаўнай бяспекі, якія маюць дачыненне да іх здзяйснення. Як толькі гэтыя матэрыялы будуць перададзены, Платформа акажа падтрымку органам крымінальнага правасуддзя ў трох еўрапейскіх дзяржавах.

## Захоўваючыяся праблемы

У сваёй працы Платформа сутыкнулася з дзвюма асноўнымі праблемамі. Па-першае, з-за эскалацыі рэпрэсій у Беларусі пацярпелыя/ахвяры і іншыя сведкі ўсё часцей неахвотна даюць інфармаваную згоду на перадачу інфармацыі і доказаў органам па прыцягненні вінаватых да адказнасці. Па-другое, некаторыя органы крымінальнага правасуддзя, з якімі Платформа ўзаемадзейнічала і ад якіх яна атрымлівала запыты аб прадастаўленні інфармацыі, не рэагавалі, калі Платформа спрабавала атрымаць ад іх больш падрабязную інфармацыю аб сферы ахопу іх запытаў або супрацоўнічаць з імі па іншых накірунках. Платформа распрацоўвае стратэгію па ўхіленні гэтых перашкод падчас Фазы III сваёй працы.

## Узмацненне падыходаў, арыентаваных на пацярпелых

У сваёй працы Платформа працягвала прымяняць падыходы, арыентаваныя на пацярпелых, у тым ліку шляхам прадастаўлення 314 пацярпелым доступу да навукова абгрунтаванай псіхалагічнай і псіхасацыяльнай падтрымцы (ПЗПСП) для пацярпелых. У справаздачны перыяд быў праведзены аналіз падыходу, арыентаванага на пацярпелых, і вызначаны стратэгіі яго ўзмацнення. Абапіраючыся на досвед працы з пацярпелымі і на кансультацыі з вонкавымі экспертамі, Платформа распрацавала дапаможнік, у якім разглядаюцца ключавыя прынцыпы ўкаранення падыходу, арыентаванага на пацярпелых, і вызначаюцца сферы, у якіх Платформа можа яшчэ больш узмацніць свой падыход, на аснове чаго адпаведныя практычныя рэкамендацыі будуць дапрацаваны ў рамках кансультатыўнага працэсу і рэалізаваны падчас Фазы III па асноўных напрамках, уключаючы інфармацыйна-тлумачальную работу і пашырэнне правоў і магчымасцяў пацярпелых, прынцып «не нашкодзь», комплекснае суправаджэнне і ўстойлівасць.

## Працяг дзейнасці ў рамках Фазы III

Платформа заручылася дастатковым фінансаваннем для працягу сваёй дзейнасці яшчэ на тры гады. Шмат чаго яшчэ трэба зрабіць для забеспячэння ўзбуджэння рэальных крымінальных спраў у будучым, асабліва ў тым, што датычыцца права пацярпелых/ахвяраў на кампенсацыю шкоды ад парушэнняў, якія прадаўжаюць учыняцца ў Беларусі і павінны быць расследаваны. Зараз Платформа можа выкарыстоўваць сваю напрацаваную інфраструктуру і досвед для прымянення больш актыўнага і дынамічнага падыходу да прыцягнення вінаватых да адказнасці, у тым ліку праз: прымяненне стратэгічных, краінавых падыходаў для прыцягнення больш шырокага кола суб'ектаў крымінальнага правасуддзя да расследаванняў і наступнага выканання сваіх следчых і пракурорскіх па-

трабаванняў; аказання пастаяннай падтрымкі суб'ектам крымінальнага правасуддзя па меры прасоўвання іх расследаванняў і, у ідэале, па меры таго, як справы будуць перадавацца, ў суд; далейшай падтрымкі расследаванняў Экспертызы УВКПЧ па Беларусі і абмену ведамі і досведам; і з дапамогай рэалізацыі стратэгій, распрацаваных падчас Фазы II, для прымянення кантэксна-арыентаваных, гендэрна-кампетэнтных падыходаў да збору і аналізу інфармацыі і фактычных дадзеных, і забеспячэння абмену атрыманымі ведамі з органамі па прыцягненню вінаватых да адказнасці.

Фаза III таксама дасць магчымасць умацаваць падыходы, арыентаваныя на пацярпелых і заснаваныя на супрацоўніцтве, якія ляжаць у аснове гэтай працы, і выканаць рэкамендацыі, падрыхтаваныя па выніках унутранага аналізу метадалогій Платформы. Гэта будзе ўключаць выяўленне і пераадоленне сацыяльных і іншых бар'ераў, якія перашкаджаюць раўнапраўнаму доступу (па гендэрнай прыкмеце) пацярпелых да псіхічнай, псіхасацыяльнай і іншай неабходнай падтрымкі.

## A. Сітуацыя ў краіне

З траўня 2020 года ў Беларусі палітвязнямі прызнаныя амаль 2 700 чалавек, у тым ліку каля 470 жанчын.[1] Па стане на 30 верасня 2023 года ў месцах пазбаўлення волі застаюцца 1 490 палітвязняў (уключаючы 164 жанчыны), у тым ліку пяць супрацоўнікаў Праваабарончага цэнтра «Вясна»: лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) Валянцін Стэфановіч, адвакат Уладзімір Лабковіч, каардынатар валанцёрскай службы «Вясна» Марфа Рабкова, валанцёр Андрэй Чапюк і Наста Лойка з арганізацыі Human Constanta. Акрамя таго, за кратамі знаходзяцца 34 журналісты і супрацоўнікі СМІ.

7 траўня 2023 года палітвязень Мікалай Клімовіч — чалавек з інваліднасцю — атрымаў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за рэпост карыкатуры на Лукашэнку, пасля чаго ў папраўчай калоніі Мікалай Клімовіч памёр. 11 ліпеня 2023 года ў зняволенні памёр палітвязень Алесь Пушкін, асуджаны за мастацкі перформанс і намаляваныя ім партрэты дзеячаў беларускага антыкамуністычнага супраціву. Афіцыйнай прычынай смерці стала некваліфікаванае аказанне медыцынскай дапамогі, аднак ёсць інфармацыя, што яму было адмоўлена ў медыцынскай дапамозе ў турэмным шпіталі.

Да гэтага часу няма дакладнай інфармацыі аб лёсе вядомых апазіцыйных палітыкаў, у тым ліку аб Марыі Калеснікавай, Мікалаю Статкевічу, Сяргею Ціханоўскім і Віктару Бабарыку, якія знаходзяцца ў ізаляцыі і без сувязі са знешнім светам на працягу да сямі месяцаў, калі яны не атрымліваюць спатканні са сваякамі і не могуць пабачыцца са сваімі адвакатамі.

Па стане на 30 верасня 2023 года ў «Спіс грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці» за ўдзел у вулічных пратэстах або ў іншых формах меркаванага іншадумства ўнесена 3 358 асоб. КДБ РБ і МУС РБ таксама прызналі экстрэмісцкімі фармаваннямі 148 арганізацый, з якіх 147 фігуруюць у спісах за сваю пратэстную дзейнасць, за распаўсюд інфармацыі, а таксама за палітычную, грамадскую і праваабарончую дзейнасць. 23 жніўня 2023 года МУС РБ прызнала Праваабарончы цэнтр «Вясна» экстрэмісцкім фармаваннем, паставіўшы кіраўніцтва арганізацыі, яе супрацоўнікаў,[2] актыўных сябраў і валанцёраў пад прамую і непасрэдную пагрозу крымінальнага пераследу.

З 15 палітычных партый, зарэгістраваных у Беларусі па стане на 1 студзеня 2023 года, афіцыйна зарэгістраванымі засталіся толькі тры праўрадавыя партыі. Акрамя таго, у траўні 2023 года была зарэгістравана праўладная партыя «Белая Русь». Усе апазіцыйныя партыі былі зачыненыя; улады таксама працягваюць ліквідаваць арганізацыі грамадзянскай супольнасці, у тым ліку нядаўна распачаты працэс ліквідацыі буйной пратэстанцкай суполкі.

У пачатку верасня 2023 года Лукашэнка прыняў указ, які істотна абмежаваў правы беларускіх грамадзян, якія жывуць за мяжой. Гэтыя грамадзяне пазбавіліся магчымасці атрымліваць новыя пашпарты ў консульскіх установах і ажыццяўляць грамадзянска-прававыя здзелкі па распараджэнні маёмасцю і адміністрацыйныя працэдуры па даверанасцях, выдадзеных за межамі Беларусі. Гэтае рашэнне адвольна дыскрымінуе правы па распараджэнні маёмасцю і практычна адмаўляе ў правах грамадзянства беларусам у выгнанні.

У чэрвені 2023 года па запрашэнні Лукашэнкі ў Беларусь увайшлі падраздзяленні расейскай прыватнай вайсковай кампаніі (ПВК) «Група Вагнера». Ім была

прадастаўлена тэрыторыя і будынкі былой вайсковай часткі ў Магілёўскай вобласці з мэтай стварэння ваеннай базы. Дзейнасць гэтай ПВК раней ужо трапляла пад пільную ўвагу экспертаў ААН па правах чалавека. Незалежная місія па ўсталяванні фактаў у Лівіі, створаная па даручэнні Рады ААН па правах чалавека, высветліла, што «Група Вагнера» здзейсніла шматлікія парушэнні правоў чалавека падчас удзелу ў канфлікце ў Лівіі, некаторыя з якіх могуць быць кваліфікаваныя як вайсковыя злачынствы.[3] Паводле расследавання «Міжнароднага радыё Францыі» (Radio France International (RFI)), якое спасылаецца на мясцовыя крыніцы і дакументы працоўнай групы ААН, расійскія найміты, якія сталі на бок арміі ўрада Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікі, абвінавачваюцца ў марадзёрстве, згвалтаваннях і забойствах, якія адбываліся з 1 студзеня па сярэдзіну красавіка 2021 года.[4] У студзені 2023 года члены Працоўнай групы па пытанні аб выкарыстанні наймітаў, а таксама спецдакладчыкі па пытаннях барацьбы з тэрарызмам, катаваннямі, гвалтоўнымі знікненнямі і за правы жанчын і меншасцяў паведамілі, што, паводле іх інфармацыі, узброеныя сілы Малі нібыта сумесна з чальцамі ПВК «Вагнер» за некалькіх дзён у пачатку сакавіка 2022 года забілі ў гэтай краіне некалькі сотняў чалавек.[5] Кіраўнік маніторынгавай місіі ААН Мацільда Богнер абвінавaціла «Групу Вагнера» ва ўчыненні вайсковых злачынстваў ва Украіне, уключаючы пакаранні смерцю ўкраінскіх ваеннапалонных. Акрамя таго, у ліпені 2023 года, паводле слоў Лукашэнкі,[6] у Беларусі была размешчана расійская ядзерная зброя. Беларускія ўлады адмовіліся ад статусу бяз'ядзернай дзяржавы ў пачатку 2022 года, правёўшы рэферэндум па змяненні Канстытуцыі. Дазвол наймітам, абвінавачаным у здзяйсненні злачынстваў супраць чалавечнасці ў іншых месцах, базіравацца ў Беларусі і дазвол выкарыстоўваць тэрыторыю Беларусі для разгортвання ядзернай зброі з'яўляецца простай пагрозай бяспецы беларускіх грамадзян і жыхароў краіны, а таксама шырэйшай пагрозай рэгіянальнай і еўрапейскай бяспецы. Гэта таксама сігналізуе аб грэбаванні беларускім рэжымам міжнароднымі нормамі і аб падтрымцы расійскай агрэсіі, накіраванай супраць Украіны.

У той жа час беларускія ўлады пераследуюць грамадзян за іх антываенную пазіцыю і за падтрымку Украіны ў канфлікце з Расіяй. Беларускія грамадзяне таксама пераследуюцца толькі за намер далучыцца да вайсковых фармаванняў, якія падтрымліваюць Украіну, па абвінавачанні ў парушэнні афіцыйнай забароны на ўдзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі іншай краіны без «дазволу» ўрада Беларусі. Нягледзячы на тое, што гэтая забарона мае расплывістае вызначэнне ў крымінальным заканадаўстве і яе парушэнне лічыцца менш цяжкім злачынствам, вінаватым пагражае турэмнае зняволенне.

## B. Выкананне асноўных мэтаў Платформы

Платформа працягнула збіраць інфармацыю і доказы ад пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў, а таксама з адкрытых крыніц для ўстанаўлення фактаў злачынстваў па класіфікацыі міжнароднага права, мерканых здзейсненых беларускімі дзяржаўнымі ўстановамі. Потым гэтая інфармацыя была перададзена нацыянальным і міжнародным органам па прыцягненню вінаватых да адказнасці. У справаздачны перыяд Платформа падтрымлівала УВКПЧ ААН у правядзенні экспертызы сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (Экспертыза УВКПЧ па Беларусі), дакладчыка Маскоўскага механізма Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) і органы крымінальнага правасуддзя дзвюх дзяржаў.

### a. Збор, захоўванне і аналіз інфармацыі і доказаў

У справаздачны перыяд Платформа сабрала інфармацыю і доказы ад 143 пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў (104 мужчыны і 39 жанчын) у дачыненні да меркаваных злачынстваў паводле кваліфікацыі міжнароднага права, у выніку чаго агульная колькасць дакументаў, уключаючы паказанні сведак, медыцынскія і судовыя пратаколы, і афіцыйныя дакументы, складае 21 092 дакументы, атрыманых ад 2 308 пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў. Гэтыя матэрыялы працягваюць перакладацца на ангельскую мову (у тых выпадках, калі гэта неабходна) і структуравацца дзеля іх аналізу і захоўвання ў базе дадзеных зачыненых крыніц. Па стане на 30 верасня 2023 года 18 222 файлаў (86%) былі прааналізаваны і прамаркіраваны ў адпаведнасці з макетам кадавання Платформы спецыяльнай групай двухмоўных рэцэнзентаў (якія валодаюць рускай і англійскай мовамі).

Адначасова Платформа працягвала збіраць аналітычныя дадзеныя з адкрытых крыніц, і зараз калекцыя гэтых матэрыялаў дасягае 815 643 адзінкі інфармацыі з адкрытых крыніц, якія аналізуюцца і захоўваюцца Платформай у сваім лічбавым архіве дадзеных з адкрытых крыніц. Для аналізу матэрыялаў з адкрытых крыніц і іх маркіроўкі (тэгавання) Платформа выкарыстоўвае розныя тэрміны і метады для пошуку адпаведных матэрыялаў, якія затым падзяляюцца на тэматычныя групы згодна са следчымі і аналітычнымі мэтамі і запытамі. Па стане на верасень 2023 года Платформа разгледзела і пратэгавала 3 500 файлаў з адкрытых крыніц, уключаючы відэазапісы пратэстаў, арыштаў і іншых інцыдэнтаў.

### b. Дапамога органам па прыцягненні вінаватых да адказнасці

Платформа працягвала ўзаемадзейнічаць і дапамагаць органам па прыцягненні вінаватых да адказнасці, уключаючы Экспертызу УВКПЧ па Беларусі, дакладчыка АБСЕ па Маскоўскім механізме і нацыянальныя органы крымінальнага правасуддзя.

#### i. Экспертыза УВКПЧ ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі

Платформа працягвае падтрымліваць Экспертызу УВКПЧ па Беларусі ў расследаванні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі ў межах яе трэцяга тэрміна пасля падаўжэння яе мандата Радай ААН па правах чалавека 4 красавіка 2023 года.[7] У справаздачны перыяд Платформа дала Экспертызе УВКПЧ па Беларусі доступ да 294 пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў (180 мужчын і 114 жанчын), і вырашыла лагістычныя пытанні, што было неабходна для апытання некаторых з іх. Акрамя таго, Платформа пачала аналізаваць свае лічбавыя архівы, што патрабуецца для рэагавання на запыт Экспертызы УВКПЧ па Беларусі аб прадастаўленні дадатковай інфармацыі і доказаў, якія датычацца шэрагу парушэнняў правоў чалавека, як мяркуецца, учыненых у Беларусі. Мы плануем прадставіць гэты матэрыял да сярэдзіны кастрычніка 2023 года. Платформа таксама працягвае цесна супрацоўнічаць з групай экспертаў Экспертызы УВКПЧ па Беларусі, праводзячы з імі рэгулярныя нарады для абмеркавання тэхнічных пытанняў па міждысцыплінарных напрамках працы.

### іі. Дакладчык Маскоўскага механізма АБСЕ

23 сакавіка 2023 года 38 дзяржаў-удзельніц АБСЕ задзейнічалі Маскоўскі механізм, прызначыўшы дакладчыка для вывучэння «пагроз выкананню палажэнняў чалавечага вымярэння, якія ствараюцца парушэннямі і ўшчамленнямі правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь».[8] Прафесар Эрвэ Асэнсіа быў прызначаны дакладчыкам 4 красавіка 2023 года з абавязацельствам прадставіць свой даклад АБСЕ да 18 красавіка 2023 года.

Пасля сустрэчы з прафесарам Асэнсіа, на якой абмяркоўвалася, як Платформа можа аказаць яму падтрымку ў вывучэнні сітуацыі, Платформа прадаставіла яму доступ (толькі для чытання) да 105 спраў, якія адносяцца да перыяду з лютага па сакавік 2022 года, а таксама да спраў, звязаных з сэксуальным гвалтам або абвінавачваннямі ў экстрэмізме, кароткае апісанне 50 спраў (з 105), вынікі аналізу матэрыялаў з адкрытых крыніц, якія тычацца дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да здзяйснення злачынстваў паводле класіфікацыі міжнароднага права, і рэкамендацыі для краін-удзельніц АБСЕ і міжнароднай супольнасці па пытанні аб неабходнасці прыцягнення вінаватых да адказнасці. Платформа зноў сустрэлася з прафесарам Асэнсіа, калі ён знаходзіўся ў службовай камандзіроўцы, каб даць яму дадатковую інфармацыю аб метадалогіі Платформы і аб сітуацыі ў Беларусі.
У сваім дакладзе АБСЕ прафесар Асэнсіа асвятліў працу Платформы, адзначыўшы наступнае:

> «Дакладчык атрымаў дакладную інфармацыю аб іх працэсах, а таксама меў асабісты доступ да значнай часткі дадзеных, датычных іх працы над дакументамі з адкрытых крыніц і да выбаркі канфідэнцыйных крыніц па асобных справах, уключаючы паказанні і рашэнні беларускіх судоў. Ён перакананы, што сабраная інфармацыя выключна дакладная.» [9]

Устанавіўшы, што ў Беларусі быў учынены цэлы шэраг парушэнняў правоў чалавека, прафесар Асэнсіа прыйшоў да высновы: «Дагэтуль урад Беларусі не зрабіў ніякіх крокаў, каб пакласці гэтаму канец, а таксама даць эфектыўныя сродкі прававой абароны пацярпелым. Наадварот, у апошнія два гады рэпрэсіўная палітыка няўхільна ўзмацнялася.»[10] Ён заклікаў краіны-ўдзельніцы АБСЕ:

- «Забяспечыць юрыдычную і тэхнічную падтрымку неабходных рэформ у Беларусі;
- Прыняць усе неабходныя меры для забеспячэння адказнасці за рэпрэсіі ў Беларусі праз нацыянальныя, рэгіянальныя або міжнародныя працэдуры;
- Правесці расследаванні і крымінальны пераслед у адпаведнасці з экстэрытарыяльнай юрысдыкцыяй, уключаючы ўніверсальную юрысдыкцыю;
- Арганізаваць наведванне цэнтраў утрымання пад вартай і судовых слуханняў для забеспячэння празрыстасці і захавання правоў чалавека;
- Даць міжнародную абарону, а таксама дазволы на пражыванне і працу беларусам у выгнанні і дапамогу ў іх інтэграцыі праз адпаведныя праграмы; і
- Разгарнуць місію па назіранні за маючымі адбыцца выбарамі, каб забяспечыць празрыстасць і справядлівасць.»[11]

Ён таксама заклікаў міжнародную супольнасць:

- «Падтрымаць ініцыятывы, мэтай якіх з'яўляецца паведамленне і дакументаванне парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, у прыватнасці, працу Міжнароднай платформы па прыцягненні да адказнасці для Беларусі (IAPB);
- Наладзіць супрацоўніцтва ў нацыянальных ці міжнародных расследаваннях;
- Падтрымаць ініцыятывы салідарнасці з ахвярамі беларускіх рэпрэсій;
- Даць дапамогу беларускім арганізацыям, праваабаронцам і журналістам у выгнанні для падтрымкі іх дзейнасці за мяжой; і
- Падтрымліваць ініцыятывы, мэтай якіх з'яўляецца захаванне беларускай мовы і культуры за мяжой.»[12]

### iii. Органы крымінальнага правасуддзя

Як паведамлялася раней, мэтай Платформы з'яўляецца захаванне і аналіз інфармацыі і доказаў па трох асноўных напрамках, якія маюць дачыненне да меркаванага ўчынення ў Беларусі злачынстваў згодна з класіфікацыяй міжнароднага права:

a. **Факты злачынстваў**, а менавіта дзеянні, што ляжаць у аснове злачынстваў супраць чалавечнасці, такія як пераследы, катаванні, сэксуальны і гендэрны гвалт, дэпартацыя, пазбаўленне волі, забойствы / пазасудовыя смяротныя пакаранні;
b. **Кантэкстуальныя элементы злачынстваў супраць чалавечнасці**, а менавіта наяўнасць шырокамаштабных ці сістэматычных нападаў, накіраваных супраць грамадзянскага насельніцтва, у адпаведнасці з палітыкай беларускай дзяржавы ці ў яе развіццё; і
c. **Датычнасць** выканаўцаў да асноўных злачынных дзеянняў, у тым ліку фізічных выканаўцаў, а таксама тых, хто нясе іншую адказнасць у сілу свайго становішча ў камандных структурах.

У справаздачным перыядзе Платформа фіналізавала дбайны аналіз сваёй калекцыі матэрыялаў па гэтых асноўных напрамках з мэтай падрыхтоўкі матэрыялаў у адказ на запыты аб прадастаўленні доступу да інфармацыі і доказаў, атрыманых ад органаў крымінальнага правасуддзя ў еўрапейскіх дзяржавах. Напрыканцы справаздачнага перыяду Платформа павінна была скончыць падрыхтоўку матэрыялаў, якія падлягаюць перадачы ў органы крымінальнага правасуддзя дзвюх краін. Гэтыя матэрыялы, якія абапіраюцца на базу дадзеных Платформы, даюць вынікі аналізу фактаў і юрыдычнага аналізу асноўных дзеянняў і кантэкстуальных элементаў злачынстваў супраць чалавечнасці, а таксама ролі структур дзяржаўнай бяспекі, якія маюць дачыненне да іх учынення. У адным з гэтых матэрыялаў таксама змяшчаюцца рэкамендацыі па прымяненні нацыянальнага крымінальнага права ў святле міжнароднага крымінальнага права. Цяпер у гэтыя матэрыялы ўносяцца апошнія штрыхі, і ў бліжэйшы час яны будуць перададзены адпаведным органам крымінальнага правасуддзя разам з асноўнай інфармацыяй і доказамі. Як толькі гэтыя матэрыялы будуць перададзены, Платформа акажа падтрымку органам крымінальнага правасуддзя ў трох еўрапейскіх дзяржавах; адна падборка матэрыялаў ужо была перададзена ў лютым 2023 года.

### c. Трывалыя праблемы

У справаздачны перыяд Платформа сутыкнулася з дзвюма асноўнымі праблемамі ў сваёй працы. Па-першае, з-за эскалацыі рэпрэсій у Беларусі пацярпелыя/ахвяры і іншыя сведкі ўсё часцей неахвотна даюць сваю згоду на перадачу інфармацыі і доказаў органам па прыцягненні вінаватых да адказнасці. У адпаведнасці з найлепшай практыкай і нашымі абавязкамі, а таксама згодна з Агульным рэгламентам Еўразвязу па абароне дадзеных, Платформа збірае і перадае інфармацыю і доказы толькі з недвухсэнсоўнай згоды асоб, якія іх далі. Для забеспячэння актуальнасці такой інфармаванай згоды і з улікам рызык небяспекі, абумоўленых кантактамі з пацярпелымі/ахвярамі і іншымі сведкамі, Платформа сістэматычна прыкладае намаганні, каб актуалізаваць такія першапачаткова дадзеныя згоды. Значная колькасць пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў зараз або не могуць выйсці на сувязь, або заблакавалі (унеслі ў «чорны спіс») кантакты Платформы, або адмовіліся даваць новую згоду. Нягледзячы на тое, што асноўныя прычыны не заўсёды паведамляюцца, Платформа разумее, што рызыкі небяспекі, якія ёсць у гэтых людзей альбо ў іх сваякоў, з'яўляюцца замінаючым фактарам. Яшчэ адным фактарам з'яўляецца страта веры ў перспектыву доступу да сродкаў прававой абароны ці будучай кампенсацыі прычыненай шкоды.

Па-другое, некаторыя органы крымінальнага правасуддзя, якія накіравалі свае запыты Платформе, не рэагавалі, калі Платформа спрабавала атрымаць больш падрабязную інфармацыю аб сферы ахопу іх запытаў або супрацоўнічаць з імі па іншых накірунках. Гэта паўплывала на магчымасць Платформы даць доступ да пацярпелых/ахвяраў і іншых сведкаў адной юрысдыкцыі, таму Платформа не задаволіць адзін запыт аб аказанні падтрымкі, як гэта планавалася зрабіць у справаздачны перыяд.

Платформа распрацоўвае стратэгіі пазбаўлення гэтых абмежаванняў падчас Фазы III.

## C. Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу

Платформа працягвае функцыянаваць у якасці кансорцыума, пры гэтым Кіраўнічы камітэт прымае стратэгічныя і палітычныя рашэнні на штотыднёвых нарадах і сумесна ўдзельнічае ў мерапрыемствах і сустрэчах зацікаўленых бакоў, як адкрытых, так і канфідэнцыйных, што рабілася на працягу ўсяго справаздачнага перыяду. На тэхнічным узроўні аператыўныя групы Платформы з чатырох арганізацый таксама працягвалі праводзіць штотыднёвыя нарады (або раз на два тыдні, па меры неабходнасці) і працаваць у цесным супрацоўніцтве над зборам і захаваннем інфармацыі і доказаў, а таксама над падрыхтоўкай адказаў на запыты органаў па прыцягненні вінаватых да адказнасці. Платформа таксама арганізавала трэнінг для чальцоў аператыўнай групы расследаванняў па адчыненых крыніцах Bellingcat. Платформа рэалізавала стратэгію больш актыўнага ўзаемадзеяння з Кансультатыўнай радай, збіраючыся кожныя два месяцы для абмену інфармацыяй і садзейнічання каардынацыі і супрацоўніцтву.

## D. Падтрымка доступу да паслуг па ахове псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымцы

Платформа працягвала ўкараняць сістэму перанакіравання да спецыялістаў за атрыманнем навукова абгрунтаванай дапамогі ў сферы псіхічнага здароўя і

псіхасацыяльнай падтрымкі (ПЗПСП), а таксама сваю адзіную сістэму клінічнага маніторынгу і ацэнкі. Падтрымка ў галіне ПЗПСП прадастаўляецца спецыялістамі, якія валодаюць рускай/беларускай і англійскай мовамі; дадзеная праграма дапамогі даступная для пацярпелых і ўсяго калектыва Платформы. Пачынаючы з ліпеня 2022 года паслугамі ў галіне ПЗПСП скарысталіся 314 пацярпелых (204 жанчыны і 110 мужчын) і рускамоўныя супрацоўнікі Платформы. У справаздачны перыяд паслугамі ў галіне ПЗПСП таксама скарысталіся 7 англамоўных супрацоўнікаў Платформы (у рамках 38 індывідуальных і 3 групавых заняткаў). Супрацоўнікі Платформы таксама прайшлі навучанне па другаснай траўме і таму, як выяўляць прыкметы эмацыйнага выгарання.

## E. Умацаванне падыходу Платформы, арыентаванага на пацярпелых і які ўлічвае аспекты атрыманых траўмаў

У падмурку працы Платформы ляжыць падыход да прыцягнення да адказнасці за злачынствы па класіфікацыі міжнароднага права, арыентаваны на пацярпелага і які ўлічвае аспекты атрыманых траўмаў. У дадатак да працягу ўкаранення метадаў, з дапамогай якіх Платформа прымяняе такі падыход, у справаздачны перыяд быў праведзены аналіз падыходу, арыентаванага на пацярпелых, і вызначаны стратэгіі яго ўзмацнення. Са студзеня па верасень 2023 года Платформа правяла падрабязны аналіз сваіх унутраных працэсаў і вызначыла практычныя крокі па далейшай інтэграцыі падыходу, арыентаванага на пацярпелых, ва ўсе накірункі сваёй дзейнасці, асабліва ў тым, што тычыцца ўзаемадзеяння з пацярпелымі.

### a. Метадалогія: кансультацыі па падыходах, арыентаваных на пацярпелых, у рабоце з дакументамі

У апошнія гады актывізаваліся ініцыятывы грамадзянскай супольнасці па прыцягненні вінаватых да адказнасці, што прывяло да распрацоўкі новых практык, арыентаваных на пацярпелых. Адпаведна, для разумення падыходаў, заснаваных на найлепшай практыцы, і вызначэння магчымасцяў па ўзмацненні сваіх падыходаў, арыентаваных на пацярпелых, Платформа кансультавалася з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і няўрадавымі арганізацыямі, а таксама з органамі ААН, якія займаюцца зборам інфармацыі і доказаў аб злачынствах па класіфікацыі міжнароднага права у мэтах прыцягнення вінаватых да адказнасці і падтрымкі пацярпелых. У іх лік увайшлі Міжнародная арганізацыя па лячэнні траўмаў (TTI), Міжнародны бесстаронні і незалежны механізм (IIIM), Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў (IRCT) і Камісія па міжнародным правасуддзі і адказнасці (CIJA). Платформа таксама правяла працэс унутранага аналізу, дакументуючы працэдуры, звязаныя з пацярпелымі, і метады ўзаемадзеяння з імі ў кантэксце рэалізацыі мэтаў Платформы.

### b. Наступныя крокі

Абапіраючыся на досвед працы з пацярпелымі і на кансультацыі з вонкавымі экспертамі, Платформа распрацавала дапаможнік, у якім разглядаюцца ключавыя прынцыпы ўкаранення падыходу, арыентаванага на пацярпелых. У дапаможніку тлумачыцца, як гэтыя прынцыпы могуць быць рэалізаваны на розных этапах пра-

цэсу дакументавання, уключаючы работу з пацярпелымі, выяўленне іх патрэбаў і рэагаванне на іх, фарміраванне метадалогіі дакументавання паказанняў пацярпелых і працу з другаснымі траўмамі. У гэтым дапаможніку вызначаны напрамкі, у якіх Платформа магла б яшчэ больш узмацніць свой падыход, на базе чаго адпаведныя практычныя рэкамендацыі будуць дапрацаваны праз кансультатыўны працэс і рэалізаваны падчас Фазы III. Асноўныя пытанні, якія падлягаюць разгляду:

- **Інфармацыйна-тлумачальная праца, пашырэнне правоў і магчымасцяў пацярпелых:** Платформа працягне інтэграваць падыход, арыентаваны на пацярпелых, у сваю інфармацыйна-прапагандысцкую стратэгію, у тым ліку праз скліканне форумаў пацярпелых, пашырэнне свайго ўзаемадзеяння з арганізацыямі і ініцыятывамі на ўзроўні супольнасцяў, якія працуюць з пацярпелымі для ахопу розных груп пацярпелых асоб, а таксама праз пашырэнне сваёй прысутнасці ў СМІ і ўзаемадзеяння з імі, выбудоўваючы камунікацыі са СМІ вакол тэмы пацярпелых/ахвяраў. Платформа будзе таксама вывучаць такія пытанні, як забеспячэнне рэалізацыі правоў і магчымасцяў пацярпелых, пашырэнне спосабаў інфармацыйнага ўзаемадзеяння з пацярпелымі па напрамках працы Платформы, больш шырокія працэдуры прыцягнення вінаватых да адказнасці.
- **Прынцып «не нашкодзь»:** Платформа працягне ўмацоўваць сваю інфраструктуру лічбавай бяспекі, кансультуючыся са знешнімі экспертамі і забяспечваючы пастаяннае выкананне існуючых працэдур бяспекі з дапамогай рэгулярных трэнінгаў і брыфінгаў.
- **Комплекснае суправаджэнне:** Платформа вызначыць магчымасці пашырэння маштабаў аказання падтрымкі ў галіне ПЗПСП, каб зрабіць яе больш комплекснай і накіраванай на павышэнне ўстойлівасці супольнасцяў пацярпелых. Акрамя таго, Платформа распрацавала спіс маршрутаў накіравання да спецыялістаў для прадастаўлення доступу да медыцынскіх, юрыдычных і сацыяльных паслуг у краінах, дзе цяпер пражывае шмат пацярпелых; гэты спіс працягне пашырацца.
- **Устойлівасць:** Платформа працягне ўключаць планаванне рэшткавых функцый у свае рэгулярныя семінары, каб вызначыць, якія функцыі неабходна захаваць у доўгатэрміновай перспектыве, і выявіць, хто за іх адказвае. Платформа таксама працягне інфармаваць донараў аб гэтым складаным пытанні, каб заручыцца іх доўгатэрміновай фінансавай падтрымкай.

## F. Сувязі з грамадскасцю і адвакатаванне

Платформа працягвала рэалізоўваць асцярожную стратэгію па сувязях з грамадскасцю, публікуючы інфармацыю аб сваёй працы ў сваім акаўнце ў Twitter (@IAPBelaurus) і на сваім вэб-сайце (www.iapbelarus.org), і прытрымлівалася асцярожнай палітыкі ў дачыненні да адвакатавання, каб захаваць незалежнасць і бесстароннасць, а таксама знешняе ўспрыманне сваёй следчай і кансультатыўнай працы як незалежнай і бесстаронняй. Тым не менш, Платформа рэгулярна ўдзельнічала ў нарадах палітычнага ўзроўню, праводзячы двухбаковыя абмеркаванні з палітыкамі і іншымі вядучымі зацікаўленымі бакамі, а часам

выступаючы і на грамадскіх форумах. Апроч шэрагу сустрэч з прадстаўнікамі розных дзяржаў Платформа прыняла ўдзел у наступных мерапрыемствах:

- Удзел у канферэнцыі «Адказнасць рэжыму Лукашэнкі за злачынствы супраць чалавечнасці і міграцыйны крызіс: перспектывы міжнароднага правасуддзя» (12 чэрвеня 2023 года), арганізаванай урадам Літвы, Аб'яднаным пераходным кабінетам Беларусі, Міністэрствам юстыцыі Літвы, Цэнтрам правасуддзя пры Цэнтры права і дэмакратыі, Літоўскім нацыянальным радыё і тэлебачаннем (LRT).
- Удзел у Варшаўскай канферэнцыі АБСЕ па чалавечым вымярэнні «Ліквідацыя беспакаранасці ў Беларусі: прыйшоў час распачаць міжнародныя дзеянні па прыцягненні рэжыму Лукашэнкі да адказнасці за злачынствы супраць чалавечнасці ў Беларусі, за саўдзел у агрэсіі супраць Украіны і за падбухторванне да генацыду ўкраінцаў», арганізаванай Міжнароднай сеткай дзеянняў у вобласці бяспекі (iSANS).
- Удзел у канферэнцыі «Станаўленне падсправаздачнасці ў Беларусі: роля АБСЕ і міжнароднай супольнасці» (3 кастрычніка 2023 г.).

## G. Інфраструктура Платформы

Да верасня 2023 года Платформа працягвала фінансавацца Аўстрыяй, Чэхіяй, Даніяй, Эстоніяй, Фінляндыяй, Германіяй, Ісландыяй, Ірландыяй, Латвіяй, Літвой, Ліхтэнштэйнам, Нідэрландамі, Нарвегіяй, Румыніяй, Славакіяй, Швецыяй, Вялікабрытаніяй і ЗША, а таксама Еўрапейскім Звязам.

У дадатак да існуючай каманды сакратарыята Платформы, якая складаецца з кіраўніка, мэнэджэра праекта, старэйшага юрысконсульта, аналітыка, следчага па адкрытых крыніцах, мэнэджара сістэм дадзеных, чатырох малодшых аналітыкаў і трох рэцэнзентаў дадзеных, у справаздачны перыяд Платформа кароткатэрмінова наняла яшчэ чатырох рэцэнзентаў дадзеных і трох экспертаў па юрыдычных пытаннях.

У справаздачны перыяд Платформа працягвала супрацу з арганізацыямі Mnemonic і FORCYD, а таксама заключыла кантракт з арганізацыяй Partners in Justice International (PJI).

## H. Перспектыўнае планаванне — Фаза III і пасля яе сканчэння

Платформа заручылася дастатковым фінансаваннем для працягу сваёй дзейнасці на наступны трохгадовы перыяд. Нягледзячы на тое, што падтрымка, якая аказваецца Платформай Экспертызе УВКПЧ па Беларусі, дакладчыку Маскоўскага механізму АБСЕ і органам крымінальнага правасуддзя, ўжо даказала сваю эфектыўнасць, шмат чаго яшчэ трэба зрабіць для забеспячэння ўзбуджэння рэальных крымінальных спраў у будучым, асабліва ў тым, што датычыцца права пацярпелых/ахвяраў на кампенсацыю шкоды ад парушэнняў, якія прадаўжаюць учыняцца ў Беларусі і павінны быць расследаваны. Гатоўнасць і здольнасць прымяняць універсальную або іншыя формы экстэрытарыяльнай юрысдыкцыі непарыўна звязаны з наяўнасцю рэсурсаў. Папаўняючы дэфіцыт рэсурсаў — уключаючы вельмі доўгі і працаёмкі працэс выяўлення і атрымання доступу да пацярпелых/ахвяраў і да іншых сведкаў і пацвярджаючых доказаў, аналіз

велізарных аб'ёмаў доказаў у рамках міжнароднага крымінальнага права, а таксама выяўленне злачынцаў і атрыманне доступу да іх — такі патэнцыял, і тым самым гатоўнасць, могуць быць павышаны. Абапіраючыся на выніку інтэнсіўнай працы, выкананай падчас Фаз I і II, Платформа можа зрабіць значна больш, каб забяспечыць выкананне ўсіх вышэйпералічаных элементаў і гарантаваць здзяйсненне правасуддзя ў доўгатэрміновай перспектыве.

Да цяперашняга моманту Платформа выканала рэсурсаёмістую працу па захаванні і аналізе значнай долі шырокай калекцыі інфармацыі і доказаў, сабраных на сённяшні дзень, і па стварэнні неабходнай для гэтага складанай тэхнічнай інфраструктуры. У існуючых абставінах Платформе неабходна прадоўжыць Фазу III, разгортваючы сваю інфраструктуру і прымяняючы свае экспертныя веды ў рамках больш актыўнага і дынамічнага падыходу да прыцягнення вінаватых да адказнасці, у тым ліку шляхам: дадання зноў сабранай інфармацыі і доказаў аб працягваючыхся злачынствах згодна з класіфікацыяй міжнароднага права ў сховішча інфармацыі і доказаў; прымянення стратэгічных краінавых падыходаў, накіраваных на прыцягненне больш шырокага кола суб'ектаў крымінальнага правасуддзя да расследавання і наступнага задавальнення іх патрэб у расследаванні і прад'яўленні пракурорскіх абвінавачанняў; аказання пастаяннай падтрымкі суб'ектам крымінальнага правасуддзя па меры прасоўвання іх расследаванняў і, у ідэале, па меры перадачы спраў у суд; прадаўжэння падтрымкі расследаванняў Экспертызы УВКПЧ па Беларусі і абмену ведамі і досведам; а таксама праз падтрымку іншых працэсаў прыцягнення вінаватых да адказнасці па меры іх узнікнення. Працягваючы выкананне Фазы III, Платформа таксама зможа рэалізаваць стратэгіі, распрацаваныя падчас Фазы II, для прымянення кантэксна-арыентаваных, гендэрна-кампетэнтных падыходаў да збору і аналізу сабранай інфармацыі і доказаў, і забеспячэння абмену атрыманымі ведамі з органамі па прыцягненні вінаватых да адказнасці.

Фаза III таксама дасць магчымасць умацаваць падыходы, арыентаваныя на пацярпелых і заснаваныя на супрацоўніцтве, якія ляжаць у падмурку гэтай працы, выканаўшы рэкамендацыі па выніках унутранага аналізу метадалогій Платформы. Гэта будзе ўключаць выяўленне і пераадоленне сацыяльных і іншых бар'ераў, якія перашкаджаюць раўнапраўнаму доступу (па гендэрнай прыкмеце) пацярпелых да псіхічнай, псіхасацыяльнай і іншай неабходнай падтрымкі, у тым ліку асоб, якія знаходзяцца ў Беларусі, а таксама ўмацаванне супрацоўніцтва і ўзмацненне каардынацыі паміж Кіруючым камітэтам Платформы і чальцамі Кансультатыўнай рады па пытаннях, звязаных з прыцягненнем вінаватых да адказнасці.

## Зноскі

1 https://spring96.org/en/news/112961
2 https://dignity.dk/en/news/joint-statement-on-belarus/
3 Рада ААН па правах чалавека, Даклад Незалежнай місіі па ўсталяванні фактаў у Лівіі (3 сакавіка 2023 г.), Дакумент ААН: A/HRC/52/83, п. 38; Даклад Незалежнай місіі па ўсталяванні фактаў у Лівіі (27 чэрвеня 2022 г.), Дакумент ААН: A/HRC/50/63, п. 32; Даклад Незалежнай місіі па ўсталяванні фактаў у Лівіі (29 лістапада 2021 г.), Дакумент ААН: A/HRC/48/83, п. 38.
4 https://www.rfi.fr/fr/afrique/20210503-en-centrafrique-des-victimes-des-exactions-russes-brisent-la-loi-du-silence
5 https://www.ohchr.org/en/press-releases/2023/01/mali-un-experts-call-independent-investigation-possible-international-crimes
6 https://www.dw.com/ru/lukasenko-rossijskoe-adernoe-oruzie-uze-v-belarusi/a-66142231
7 Рада ААН па правах чалавека; Рэзалюцыя 52/29, прынятая Радай па правах чалавека 4 красавіка 2023 года; Стан у галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх (4 красавіка 2023 г.); Дакументы ААН; A/HRC/RES/52/29, п. 15.
8 АБСЕ, Даклад экспертаў Маскоўскага механізма Пастаяннай радзе АБСЕ па Беларусі (11 траўня 2023 г.), https://www.osce.org/permanent-council/543249.
9 Місія АБСЕ па ўстанаўленні фактаў у Беларусі (2023 г.) ў адпаведнасці з пунктам 12 Дакумента Маскоўскага механізма, Даклад аб сур›ёзнай пагрозе чалавечаму вымярэнню АБСЕ ў Беларусі з 5 лістапада 2020 года (11 траўня 2023 г.), ODIHR.GAL/39/23/Corr.1*, п. 28.
10 Тамсама, стар. 4.
11 Тамсама, стар. 6.
12 Тамсама, стар. 6.